Да 75-годдзя вызвалення Беларусі
ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

# НА МОВЕ ПАЭЗІІ

**2 мая член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат Прэміі імя А.І.Дубко, гродзенская паэтэса Людміла Шаўчэнка прыняла ўдзел у дне інфармацыі на тэму “Вялікая вайна – вялікая перамога”, прымеркаваным да значнай падзеі ў гісторыі нашай краіны – 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

Мерапрыемства было арганізавана аддзелам інфармацыйна-бібліяграфічнай работы ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага”. Падчас сустрэчы прагучалі вершы Людмілы Шаўчэнка з цыкла “С той далёкой войны” ў выкананні аўтара. Слухачы – вучні 8 і 10 класаў і настаўнікі сярэдняй школы № 7 – выказалі падзяку за пранікнёныя творы, непасрэднаць асабістых успамінаў і шчырыя думкі аб сучасным успрыманні падзей Вялікай Айчыннай вайны.

**Аддзел інфармацыйна-бібліяграфічнай работы**
**ДУК ГАНБ імя Я. Ф. Карскага**

**На фота:** дзень інфармацыі на тэму “Вялікая вайна – вялікая перамога” з удзелам вучняў і настаўнікаў сярэдняй школы № 7 г. Гродна, а таксама члена СПБ, гродзенскай паэтэсы Людмілы Шаўчэнка. ДУК “Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф.Карскага” 2 мая 2019 года.




ЧЫТАЕМ РАЗАМ ТВОРЫ ПРА ГЕРОЯЎ





